Дзядоў няма… А памяць пра іх жывая!

СТАР.4

Схіл быў увесь чырвоны ад суніц

СТАР.5

Падпішыся на «Звязду» і выйграй! Яшчэ і трымер…

СТАР.6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 МАЯ 2014 г. АЎТОРАК № 96 (27706) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НАДЗЕЙНЫ ПАРТНЁР У СТРАТЭГІЧНА ВАЖНЫМ РЭГІЁНЕ

Ім за гады незалежнасці стаў для Беларусі Таджыкістан

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на перамовах у Мінску з Прэзідэнтам Таджыкістана Эмамалі Рахмонам, паведамляе БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што візіт Прэзідэнта Таджыкістана своечасовы, каб узмацніць двухбаковыя адносіны па пэўных напрамках і выйсці на нармальны ўзровень супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай сферы. Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што ў дзвюх краін няма праблем у развіцці стасункаў у палітычнай, дыпламатычнай, ваенна-палітычнай сферах; краіны з'яўляюцца членамі АДКБ, СНД і не маюць рознагалоссяў па міжнародным парадку дня.

У сваю чаргу Эмамалі Рахмон выказаў упэўненасць, што ў краін ёсць вялікія рэзервы і магчымасці для развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Ён падзякаваў Беларусі за аказанне сур'ёзнай дапамогі Таджыкістану ў падрыхтоўцы спецыялістаў у розных галінах, а таксама ваенных кадраў, пагранічнікаў. «Беларусь заўсёды падтрымлівала Таджыкістан у цяжкую хвіліну — і ў рамках АДКБ, і на двухбаковай аснове, і асабліва па ўмацаванні таджыкістанска-афганскай мяжы», — сказаў Эмамалі Рахмон.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што рухавіком інтэграцыйных працэсаў сёння з'яўляецца эканоміка. У сувязі з гэтым кіраўнікі дзяржаў выказалі занепакоенасць негатыўнымі тэндэнцыямі знішчэння ўзаемнага таваразвароту ў апошнія два гады. Бакі дамовіліся, што міжурадавая камісія зробіць усё магчымае, каб аднавіць былы ўзровень таваразвароту і перасягнуць яго. На думку беларускага лідара, асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на эфектыўнае выкананне міждзяржаўнай праграмы эканамічнага супрацоўніцтва да 2020 года.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускі бок можа прапанаваць партнёрам з Таджыкістана ажыццяўленне паставак беларускіх тавараў па лізінгавых схемах, а таксама з прымяненнем ільготнага крэдытавання, у тым ліку з удзелам таджыкістанскіх банкаў.

З улікам актыўнага развіцця ў Таджыкістане аграрнага сектара, тэхналагічнага пераўзбраення, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь гатова ў поўным аб'ёме задаволіць попыт у Таджыкістане на тэхніку, забяспечыўшы пры гэтым комплекснае сэрвіснае суправаджэнне. Беларускі лідар прапанаваў сумесна з партнёрамі з Таджыкістана сфарміраваць сетку машынна-трактарных станцый, а таксама стварыць сумесныя зборачныя вытворчасці сельгастэхнікі.

Беларускі бок гатовы падпісаць ліцэнзійны дагавор на выкарыстанне тэхналогій, ноу-хау і тэхнічнай дакументацыі, дакументаў на права выкарыстання таварнага знака «Беларусь». Дадаткова ў рамках арганізацыі вытворчасці беларускі бок гатовы навучаць спецыялістаў з Таджыкістана, накіроўваць беларускіх экспертаў у гэтую краіну для перадачы досведу.

Прэзідэнт Беларусі лічыць перспектыўнай ідэю стварэння вытворчасці сельскагаспадарчага навяснога, прычапнога абсталявання ў Таджыкістане. Беларускі бок вітае прамыя пастаўкі з Таджыкістана высакаякаснай бавоўны, валакна і гатовы разглядаць прапановы па імпарце сельгаспрадукцыі, алюмінію.

На думку беларускага лідара, пазітыўным фактарам для пашырэння беларуска-таджыкістанскага партнёрства з'яўляецца зацікаўленасць рэгіёнаў у прамых кантактах. Ён звярнуў увагу на тое, што падпісанне адпаведных дакументаў і далейшая іх рэалізацыя надасць гэтым стасункам больш сістэмны характар.

Акрамя таго, кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў неабходнасць наладжвання сувязяў паміж суб'ектамі гаспадарання, больш актыўнае выкарыстанне патэнцыялу ўзаемадзеяння гандлёва-прамысловых палат, іншых структур, якія аб'ядноўваюць дзелавыя колы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на важнасць развіцця гуманітарнага супрацоўніцтва, адносін у сферы адукацыі і культуры. Ён лічыць важным аднавіць практыку абмену Днямі культуры і выказаў гатоўнасць правесці Дні культуры Беларусі ў Таджыкістане ў 2015 годзе.

«Мы канструктыўна ўзаемадзейнічаем на сусветных перамоўных пляцоўках, з'яўляючыся саюзнікамі ў рамках СНД і АДКБ, і зацікаўлены ў пашырэнні ўзаемных сувязяў з Таджыкістанам у розных галінах: палітычнай, гандлёва-эканамічнай, ваенна-тэхнічнай, гуманітарнага супрацоўніцтва», — сказаў беларускі лідар.

Эмамалі Рахмон у сваю чаргу падкрэсліў: «Не сумняваюся, што вынікі перамоў таксама будуць спрыяць выраду адносін партнёрства на якасна новы ўзровень. Для гэтага ёсць усе ўмовы і неабходныя перадумовы, уключаючы палітычную волю кіраўніцтва дзвюх краін».

Па выніках перамоў у прысутнасці прэзідэнтаў бакі падпісалі пакет дакументаў, якія пашыраюць супрацоўніцтва ў прамысловай, сацыяльнай і гуманітарнай сферах, а таксама на рэгіянальным узроўні. Падпісаныя дакументы вызначаюць параметры дзеянняў на бліжэйшыя гады ў ключавых сферах.

Падводзячы вынікі перамоў, Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на іх прадметным і канструктыўным характары. Прэзідэнты абмеркавалі шырокае кола тэм, якія тычацца як развіцця беларуска-таджыкістанскіх адносін, так і супрацоўніцтва на міжнароднай арэне, у ААН, СНД, АДКБ і ШАС. Бакі з задавальненнем канстатавалі падабенства пазіцый па ўсіх пытаннях.

Эмамалі Рахмон таксама выказаў задавальненне дзелавым і даверным характарам праведзеных перамоў і запрасіў кіраўніка беларускай дзяржавы наведаць Таджыкістан з афіцыйным візітам.

СВЯТА СКОНЧЫЛАСЯ — СВЯТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА!

Такім чынам, свята, якога мы чакалі пяць доўгіх гадоў, скончылася. У нядзелю, бліжэй да поўначы, з фінальным свістком суддзяў на «Мінск-Арэне» 78-ы чэмпіянат свету па хакеі стаў гісторыяй. Што можна сказаць пра яго па гарачых слядах? Калі коратка падсумаваць выказванні спецыялістаў, спартсменаў, балельшчыкаў з дзясяткаў краін, якія сталі ў гэтыя дні гасцямі Мінска, то яны аднадушныя — гэта было сапраўднае свята, чэмпіянат прайшоў на самым годным узроўні, быў паказаны хакей найвышэйшага класа. Хакеісты, трэнеры, заўзятары прызнаваліся, што атрымалі максімальнае задавальненне ад самога мерапрыемства і ўдзелу ў ім. Пабіты рэкорд наведвання хакейных паядынкаў на чэмпіянатах свету — больш як 650 тысяч гледачоў непасрэдна глядзела вялікі хакей на трыбунах сталічных лядовых арэн, і больш як 1 мільярд тэлегледачоў — ля экранаў сваіх тэлевізараў па ўсім свеце.

Чэмпіянат, падарыўшы людзям з розных краін незабыўныя эмоцыі падчас спартыўных баталій на мінскіх лядовых арэнах, а таксама яркія ўражанні аб нашай гасціннасці, сталіцы і мінчанах, аб Беларусі і беларусах у цэлым, пераканаўча даказаў, што наша краіна заўсёды была адкрыта свету. Беларусь даказала, што мы можам арганізоўваць спартыўныя першынствы любога ўзроўню, і хацелася б, каб гэты факт быў прыняты да ўвагі грамадскасцю ўсяго свету. А значыць, мы не развітваемся і кажам усім: да новых сустрэч!

Фотаздымкі Анатоля КПЕШЧУКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай ЛАДУЦЬКА, старшыня Мінгарвыканкама:

«У Мінску завяршылася падзея сусветнага ўзроўню, да якой мы рыхтаваліся на працягу пяці гадоў. Гэтыя два з паловай тыдні прайшлі вельмі арганізавана, усе намечаныя мерапрыемствы выкананы. Хачу выказаць словы падзякі ўсім службам, якія забяспечвалі правядзенне ЧС, работа вялася зладжана. Эфектыўна спрацавалі камунальныя службы, супрацоўнікі органаў правапарадку. Мы не атрымалі прэтэнзій па рабоце гасцінічнага комплексу, спартыўных аб'ектаў. Выдатна сябе зарэкамендавалі зоны гасціннасці ў раёне Студэнцкай вёскі і каля Палаца спорту. Я думаю, што не толькі госці, але і мінчане прывыклі да тых мерапрыемстваў, якія праходзілі тут».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.05.2014 г.

Долар ЗША	10060,00	▼
Еўра	13720,00	■
Рас. руб.	295,00	▲
Укр. грыўня	845,38	▲

■ Год гасціннасці: адкрый Беларусь!

ПА МІФЫ І ЛЕГЕНДЫ — НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

Каб выпрабаваць на сабе ўсе асаблівасці экстрэмальных прыгод, карэспандэнт «Звязды» праехала на двухколавым транспарце 250 кіламетраў

У апошнія гады веларух у Беларусі актыўна набірае абароты: усё больш людзей імкнецца да здаровага ладу жыцця і таму перасаджваецца на веласіпеды. Яшчэ летась да Года гасціннасці ў Магілёве распрацавалі некалькі цікавых веласіпедных вандровак па 8 раёнах вобласці пад агульным брэндам «Край жыватворных крыніц». Быў створаны сайт, схемы маршрутаў, пракладзены першыя турыстычныя сцежкі.

Адкрыццё сёлетняга сезона пачалося з 4-дзённага падарожжа пад прывабнай назвай «Міфы і легенды краю жыватворных крыніц». У наш спіс трапілі самыя вядомыя з іх — Бразгун у Чэрыкаўскім раёне, Блакітная — у Слаўгарадскім, Захаранка — у Быхаўскім. У тых лясных запаведных мясцінах, дзе яны бруяцца, нават кожны каменьчык, здаецца, мае непаўторную гісторыю. А што казаць пра такія жамчужыны Магілёўшчыны, як Быхаўскі замак, Баркалабаўскі жаночы манастыр, палац Жукоўскіх у аграгарадку Дашкаўка — усе яны якраз знаходзяцца на шляху. А яшчэ арганізатары абяцалі сустрэчы з прывідамі, чарадзейную вылечку і рускую лазню. Ну як было не спакусіцца?

СТАР.8

■ Надвор'е

СПЯКОТА АДПУСЦІЦЬ НА ФОНЕ СУР'ЁЗНЫХ ДАЖДЖОЎ

На гэтым тыдні характар надвор'я істотна зменіцца і пахаладае, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Аднак у аўторак на тэрыторыі Беларусі яшчэ будуць гаспадарыць цёплыя няўстойлівыя масы. Таму сёння ў большасці раёнаў чакаюцца кароткачасовыя дажджы, а часам магчымы навальніцы. Месцамі па краіне пройдуць моцныя ліўні, у асобных раёнах — град. Пры навальніцах месцамі шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад плюс 22 градусаў па паўночным захадзе да 31 цяпла па паўднёвым усходзе краіны.

І ў сераду амаль паўсюдна па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі і моцнымі ліўнямі. Пахаладае. Тэмпература паветра ўначы на сераду складзе плюс 11–18 градусаў, а на поўначы краіны толькі 8–10 цяпла. Удзень тэмпературны фон знізіцца да 13 цяпла па паўночным захадзе і толькі па паўднёвым усходзе складзе да плюс 26 градусаў. Кароткачасовыя дажджы і навальніцы будуць у нас 29 і 30 мая. У чацвер на паўднёвым усходзе Беларусі месцамі моцныя дажджы. Стане яшчэ халадней. Тэмпература паветра ўначы будзе пераважна плюс 6–13 градусаў, удзень чакаецца 12–19 цяпла. Толькі на поўдні Гомельскай і Магілёўскай абласцей удзень месцамі да плюс 20–25 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, нават на выхадныя нас чакаюць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы стане 5–12 цяпла, а ўдзень — плюс 13–20 градусаў. Толькі на паўднёвым усходзе будзе на 5–6 градусаў цяплей.

Сяргей КУРКАЧ

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАРАШЭНКА ПЕРАМАГАЕ ВА ЎСІХ АБЛАСЦЯХ УКРАІНЫ

Ва Украіне ўчастковыя выбарчыя камісіі скончылі падлік галасоў і перадалі звесткі ў акруговыя выбаркамы. Працягваецца апрацоўка галасоў. Пакуль даныя падліку супадаюць са звесткамі экзіт-полаў. У першым туры перамагае кандытарскі магнат Пятро Парашэнка. Ён набірае каля 55%. Як паведамляе ЦВК, ён сабраў большасць галасоў ва ўсіх рэгіёнах Украіны. Найбольш за яго галасавалі на Львоўшчыне (70%) і Вінніччыне (66%). У Луганскай вобласці ён набірае 33%, а ў Данецкай — 40%. Праўда, там галасаванне адбылося толькі на траціне тэрыторыі. Гэта першы ў гісторыі ўкраінскіх выбараў выпадак, калі ўсход і захад галасавалі амаль салідарна. Беларусь паважае выбар украінскага народа і гатова да далейшага канструктыўнага супрацоўніцтва са сваім суседам. Аб гэтым гаворыцца ў заяве Міністэрства замежных спраў Беларусі ў сувязі з правядзеннем ва Украіне пазачарговых прэзідэнцкіх выбараў. «Неабходна канстатаваць, што выбарчая кампанія праходзіла ў беспрэцэдэнтна жорсткай і напружанай абстаноўцы. На жаль, частка грамадзян не была ўключана ў выбарчы працэс. Разам з тым украінская грамадства прадэманстравала высокі ўзровень грамадзянскай свядомасці і імкненне пачаць рух да забеспячэння нацыянальнай згоды, унутранай стабільнасці і ўстойлівага эканамічнага і палітычнага развіцця», — адзначаецца ў заяве.

ПАМЁР ВОЙЦЕХ ЯРУЗЕЛЬСКІ

Ён пайшоў з жыцця ў неўралагічным аддзяленні шпіталя Ваенна-медыцынскага інстытута ў Варшаве. Два тыдні таму ён перанёс інсульт. 6 ліпеня былому кіраўніку сацыялістычнай Польшчы споўніўся б 91 год.

Як адзначае Reuters, палякі да гэтага часу не прыйшлі да адзінай ацэнкі гэтай супярэчлівай палітычнай фігуры. Дата і месца пахавання пакуль не прызначаны — спачатку ўлады маюць намер правесці кансультацыі з сям'ёй.

Генерал арміі Ярузельскі ў лютым 1981 года ўзначаліў Савет міністраў Польскай Народнай Рэспублікі, а ў снежні ў разгар беспарадкаў увёў ваеннае становішча, за што пасля яго неаднаразова спрабавалі прыцягнуць да адказнасці. Аднак ён жа адным з першых сярод усходнееўрапейскіх лідараў павёў краіну па шляху рэформаў.

Ярузельскі быў адзіным кіраўніком Польшчы ўсе 1980-я гады, а ў перыяд ваеннага становішча з 1981 па 1983 год яго ўлада была і зусім неабмежаванай. На працягу гэтага часу ён душыў як спробы дэстабілізаваць сітуацыю ўнутры краіны, так і рэзка адкідваў прапановы аб уводзе савецкіх войскаў на тэрыторыю краіны.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ВОЦАТ ЯК СУПЕРПРАДУКТ

Інстытут харчовых тэхналогій устанавіў: пэўныя тыпы воцату могуць замяніць горы лекаў, перадае The Malay Mai. Ён багаты на антыаксіданты, якія тармозяць працэс старэння, а таксама запавольвае працэс развіцця раку і дэгенератыўных захворванняў мозга. Воцат валодае супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі, памяншае ўздзеянне дыябету на арганізм. Паляпшаецца стан сардэчна-сасудзістай сістэмы і зніжаецца ціск. Ёсць звесткі і пра тое, што воцат дапамагае спартсменам аднавіцца пасля моцных фізічных нагрузак. А калі чалавек штодня спажывае воцат, у яго зніжаецца апетыт. І гэта каштоўная знаходка для людзей, якія жадаюць пазбавіцца ад лішніх кілаграмаў.

Пры гэтым штодзённае ўжыванне адной-дзвюх лыжак воцату можа павысіць узровень наяўнасці ў арганізме «добрага» халестэрыну, лічаць даследчыкі.

КОРАТКА

У сувязі з тым, што ў бліжэйшыя дні пачнуцца летнія канікулы, па ўсёй Беларусі з 26 мая па 6 чэрвеня ДАІ праводзіць спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Увага — дзеці!». У дні акцыі трэба рухацца ў светлы час сутак з уключаным блізкім святлом фар.

Пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета адбудзецца 29 мая ў Астане. На ім плануецца падпісаць Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе, які ўступіць у сілу з 1 студзеня 2015 года.

Станцыю метро «Малінаўка» плануецца адкрыць для пасажыраў у першай дэкадзе чэрвеня. Пробны поезд да станцыі праехаў 23 мая. Цяпер завяршаюцца работы па канчатковай рэгуляваньні сістэм.

Беларусы сталі чэмпіёнамі Еўропы па футзале. У вырашальным паядынку 11-га кантынентальнага першынства, якое прайшло ў Празе, падапечныя Сяргея Сафонава выйгралі ў зборнай Бельгіі з лікам 2:1.